В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

# СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ

**Сінтаксіс** — раздзел граматыкі, у якім вывучаюцца словазлучэнні і сказы, іх будова і тыпы.

**Пунктуацыя** — 1) сістэма знакаў прыпынку; 2) правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў пісьмовым тэксце.

## Словазлучэнне

пытанне

галоўнае слова + залежнае слова

**Словазлучэнне** — сінтаксічная адзінка мовы, якая складаецца з двух і больш слоў, аб'яднаных па сэнсе і граматычна на аснове падпарадкавальнай сувязі.

## Тыпы словазлучэнняў

### 1. Паводле граматычнага выражэння галоўнага слова

| Тыпы словазлучэнняў | Прыклады |
|---|---|
| 1. **Дзеяслоўныя**, у якіх галоўнае слова выражана:<br>спрагальнымі формамі дзеяслова | (што?) чытаць кнігу<br>(як?) вучыцца старанна |
| дзеепрыметнікам | (з кім?) разлучаныя з братам |
| дзеепрыслоўем | (калі?) развітаўшыся раніцай |
| 2. **Іменныя**, у якіх галоўнае слова выражана:<br>назоўнікам (назоўнікавыя) | (які?) штучны спадарожнік |
| прыметнікам (прыметнікавыя) | (ад чаго?) белы ад снегу |
| лічэбнікам (лічэбнікавыя) | (дзе?) трэці злева |
| займеннікам (займеннікавыя) | (якія?) усе шчаслівыя |



© ТДА «Аверсэв»

| Тыпы словазлучэнняў | Прыклады |
|---|---|
| 3. **Прыслоўныя**, у якіх галоўнае слова выражана прыслоўем | ад чаго?<br>далёка ад горада |

## 2. Паводле будовы (структуры)

| Простыя | Складаныя |
|---|---|
| два самастойныя словы<br>каму?<br>ліст сястры<br>у якой меры?<br>вельмі далёка | тры (і больш) самастойныя словы<br>якая?<br>хата з чырвонымі аканіцамі |

# Віды сувязі слоў у словазлучэнні

| Дапасаванне | |
|---|---|
| пытанне?<br>залежнае слова + галоўнае слова<br>род, лік, склон | які?<br>знакаміты мастак<br>(м. р., адз. л., Н. скл. = м. р., адз. л., Н. скл.) |
| **Кіраванне** | |
| пытанне?<br>залежнае слова + галоўнае слова<br>(склон) склон? | што?<br>пісаць пераказ (В. скл.) |
| **Прымыканне** | |
| пытанне?<br>залежнае слова + галоўнае слова<br>прыслоўе, інфінітыў ці дзеепрыслоўе – па сэнсе | як?<br>прыгожа піша<br>што?<br>папрасіць пачытаць<br>як?<br>пісаць спяшаючыся |



© ТДА «Аверсэв»

# Сінтаксічны разбор словазлучэння

## Парадак разбору

1. Простае ці складанае.
2. Галоўнае і залежнае словы.
3. Тып словазлучэння.
4. Від сінтаксічнай сувязі.

## Узор разбору

Я слаўлю дружбу.

*Слаўлю дружбу* — простае словазлучэнне; галоўнае слова *слаўлю* выражана дзеясловам; залежнае слова *дружбу* выражана назоўнікам; словазлучэнне дзеяслоўнае; від сінтаксічнай сувязі — кіраванне.

# Сказ

**Сказ** — гэта сінтаксічная адзінка мовы, што складаецца з аднаго ці некалькіх слоў, якія выражаюць закончаную думку, граматычна і інтанацыйна афармленую па законах мовы.

# Адрозненне сказа ад словазлучэння

| Сказ | Словазлучэнне |
|---|---|
| 1. Служыць сродкам моўных зносін, сродкам фарміравання і выражэння думкі, г. зн. выконвае камунікатыўную функцыю.<br>2. Мае граматычную аснову (адзін ці два галоўныя члены).<br>3. Характарызуецца сэнсавай і інтанацыйнай завершанасцю | 1. Служыць для больш дакладнага, чым слова, называння прадметаў, дзеянняў і іх прымет.<br>2. Складаецца з галоўнага і залежнага слова |

# Тыпы сказаў

| | | |
|---|---|---|
| Па мэце выказвання | апавядальныя<br>пытальныя<br><br>пабуджальныя | У небе спяваў жаўранак (І. Шамякін).<br>Хто і куды скіроўвае хмурынкі? (В. Зуёнак).<br>Красуй, расці, калгасны сад (А. Астрэйка). |



© ТДА «Аверсэв»

| | | |
|---|---|---|
| Па структуры | простыя<br>складаныя | А хмары ўсталі нечакана (Я. Колас).<br>Люблю вясну, што ў кветкі, зелень аздобіць радасна зямлю (К. Буйло). |
| Па інтанацыі | клічныя<br>няклічныя | Мой родны кут, як ты мне мілы!.. (Я. Колас).<br>Быў якраз пачатак мая (Я. Колас). |
| Па наяўнасці даданых членаў сказа | развітыя<br>неразвітыя | Сонейкам цёпленькім, зеленню вабнаю абдаравала зямельку вясна (Я. Купала).<br>Возера дрэмле (П. Трус). |
| Па саставе | двухсастаўныя<br>аднасастаўныя | Высока ў сінім бязвоблачным небе плыве яркае сонца (І. Навуменка).<br>Зіма. Снягі. Мароз. Завеі (П. Глебка). |
| Па адносінах да зместу выказвання | сцвярджальныя<br>адмоўныя | Яшчэ ў пачатку ліпеня бывае зжаўцее адзін-адзінюткі лісток на бярозе (К. Чорны).<br>Дрэвы яшчэ не распусціліся (У. Дамашэвіч).<br>У нас нікога ў хаце няма (М. Зарэцкі). |

## Просты сказ

**Просты сказ** — гэта такі сказ, у якім маецца толькі адна граматычная аснова (дзейнік і выказнік ці толькі адзін галоўны член).



© ТДА «Аверсэв»

# Тыпы простых сказаў паводле будовы

## 1. Па наяўнасці галоўных членаў

| | |
|---|---|
| Двухсастаўныя (дзейнік і выказнік) ± даданыя члены сказа | Першым снегам іскрыцца абрус на сцяне (П. Броўка). Наступіла восень. Птушкі сабраліся ў вырай. |
| Аднасастаўныя (граматычная аснова — адзін галоўны член сказа) ± даданыя члены сказа | а) з галоўным членам дзеясловам:<br>пэўна-асабовыя (1-я ці 2-я ас. адз. ці мн. л. цяп. і буд. ч.): Ехалі з песнямі. Люблю наш край.<br>няпэўна-асабовыя (3-я ас. мн. л. цяп. і буд. ч., а таксама дзеясл. мн. л. пр. ч.): Усюды чакалі дажджу. У лесе сёлета ягад набяруць.<br>абагульнена-асабовыя (2-я ас. цяп. і буд. ч.; 2-я ас. заг. л.; рэдка — 1-я і 3-я ас.) Не рабі ліхога і не бойся нікога. Салаўя песнямі не кормяць.<br>безасабовыя (безас. дзеясл., дзеепрым.; няма, не было): Не сядзіцца ў хаце хлопчыку малому (Я. Колас). Развіднела. Стала хораша на сэрцы (І. Шамякін).<br>б) з галоўным членам назоўнікам:<br>назыўныя (назоўнікі ў назоўным склоне, спалучэнне слоў): Ноч. Халодная зямлянка. Перастрэлка. Цішыня (П. Глебка). |

## 2. Па наяўнасці членаў сказа

| | |
|---|---|
| Поўныя (усе неабходныя члены сказа) | Вясна непрыкметна перайшла ў лета (Т. Хадкевіч). Дуб — мудрае дрэва (Я. Колас). Ціхая дарога. Змяркаецца. |
| Няпоўныя (прапушчаны які-небудзь член сказа) | Я пайшоў у бібліятэку. *Алесь — на каток.* *За дарогай адразу кусцікі. За вёскай — бярозавы гай.* |



© ТДА «Аверсэў»

## 3. Па наяўнасці аднародных і адасобленых членаў сказа, зваротка, устаўных, пабочных канструкцый

| | |
|---|---|
| Няўскладненыя | Усяму жывому зямля дорыць шчодрасць (Т. Хадкевіч). У блакіце жаўрук. |
| Ускладненыя | Адгукніся, вясна, мне зязюляй з-за рэчкі (А. Куляшоў). Нічога не кажучы, засунуў дзед Талаш за пояс сякеру... (Я. Колас). Дзень быў лагодны, ціхі. |

# Галоўныя члены сказа

## Дзейнік

**Дзейнік** — галоўны член сказа, які абазначае прадмет, што з'яўляецца ўтваральнікам дзеяння ці носьбітам прыметы, названых выказнікам, і адказвае на пытанні назоўнага склону хто? або што?

| Спосаб выражэння | Прыклады |
|---|---|
| 1. Назоўнікам у назоўным склоне (ці іншай часцінай мовы, ужытай у значэнні назоўніка) | Дрэмлюць сінія прасторы (С. Шушкевіч). Прахожы азірнуўся (В. Быкаў). Дзесяць дзеліцца на пяць. Гэтае «але» яго насцярожыла. Гучнае «ўра» пракацілася над плошчай. |
| 2. Займеннікам у назоўным склоне | Я песняй мілую сваю праслаўлю (Я. Купала). |
| 3. Неазначальнай формай дзеяслова | Праз гэты двор прайсці прыемна: тут відзен клопат... (Я. Колас). |
| 4. Спалучэннем слоў | Міхась з Антосем, як старыя, займалі месцы канцавыя (Я. Колас). |
| 5. Фразеалагізмам | Праваднік быў рады, што знайшлася жывая душа, з якой можна было бавіць час (А. Кудравец). |



© ТДА «Аверсэв»

## Выказнік

**Выказнік** — галоўны член сказа, які абазначае дзеянне, стан ці прымету прадмета, што названы дзейнікам, і адказвае на пытанні што робіць прадмет? што з ім адбываецца? які ён? і інш.

## Тыпы выказнікаў і спосабы іх выражэння

### А. Просты дзеяслоўны выказнік

| Спосаб выражэння | Прыклады |
|---|---|
| 1. Дзеясловам абвеснага ладу (цяп. ч., пр. ч., буд. ч. — простым ці складаным) | Жаўцее вузкі беражок недааранай нівы (М. Маляўка). Восень косы гаёў расчасала (М. Лужанін). Бацька зморaны прыйдзе спачыць (М. Лужанін). |
| 2. Дзеясловам умоўнага ладу | Я сеў бы на каня і паказаў бы яшчэ, чаго варты стары Талаш! (Я. Колас). |
| 3. Дзеясловам загаднага ладу | Ты з працай зрадніся, мой сын, назаўжды (А. Бялевіч). |
| 4. Неазначальнай формай дзеяслова | Шчасце — жыць у свабоднай краіне. |
| 5. Усечанымі формамі дзеяслова | Па вадзе нешта шась! (Я. Колас). |
| 6. Фразеалагізмам | Вельмі ж даўся ў знакі ўсім пан Ясінскі і яго цівун Дракула (А. Якімовіч). |



© ТДА «Аверсэв»

## Б. Састаўны дзеяслоўны выказнік

| дапаможны дзеяслоў (звязка) | + | неазначальная форма дзеяслова |
|---|---|---|

| Значэнне | Дзеясловы | Прыклады |
|---|---|---|
| 1. Пачатак, канец і працяг дзеяння | пачаць, пачынаць, стаць, працягваць, канчаць, кінуць і інш. | Апоўдні стаў збірацца народ (І. Дуброўскі). Далі пачалі мутнець і зліваццa зсінню (З. Бядуля). |
| 2. Магчымасць, немагчымасць, волевыяўленне, пажаданасць | магчы, жадаць, збірацца, рашаць, імкнуцца, марыць, дазволіць і інш. | Я, таварышы, рашыў падараваць вепра вам, чырвоныя ваякі (Я. Колас). Журавінка ўстаў, азірнуўся, нешта хацеў сказаць (М. Лобан). |
| У ролі звязкі могуць выступаць некаторыя кароткія прыметнікі (*павінен, рад, гатоў, абавязан*) у спалучэнні з дзеясловам *быць*: Косця рад быў выканаць дзедава даручэнне (А. Якімовіч). Чалавек павінен імкнуцца да вышэйшай мэты ў жыцці. | | |

## В. Састаўны іменны выказнік

| дзеяслоў-звязка | + | іменная частка |
|---|---|---|

| Дзеяслоў-звязка | Іменная частка | Прыклады |
|---|---|---|
| быць (нулявая звязка, у цяп. ч. ёсць)<br>быў (пр. ч.)<br>будзе (буд. ч.)<br>будзь (заг. л.)<br>быў бы (ум. л.) | назоўнік<br>прыметнік<br>лічэбнік<br>займеннік<br>дзеепрыметнік | Што ні кажы, а жыццё ёсць радасць, вялікае шчасце, бясцэнны дар (Я. Колас). Дзень быў ясны, сонечны. Дзесяць і пяць будзе пятнаццаць. Гэта кніга мая. Сталы былі засланы беласнежнымі настольнікамі. Будзь настойлівым у дасягненні мэты. Была б Агата дома, то памагла б сыну. |



© ТДА «Аверсэв»

• У ролі дзеяслова-звязкі могуць ужывацца словы *стаць, з'яўляцца, лічыцца, называцца, здавацца, станавіцца,* напрыклад: Максім стаў маўклівым і разважлівым не па гадах. Дзень выдаўся ціхім, бязветраным.

• Ролю звязкі могуць выконваць таксама дзеясловы са значэннем руху і стану *ісці, стаяць, сядзець,* напрыклад: Апошнія восеньскія дні стаялі ціхія, цёплыя.

## Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам

| Працяжнік ставіцца | Працяжнік не ставіцца |
|---|---|
| 1. Паміж назоўнікам і назоўнікам:<br>Песня — душа народа. | 1. Паміж асабовым займеннікам і назоўнікам:<br>Ён тэатральны крытык.<br>**Але:** калі лагічна выдзяляюцца, то працяжнік ставіцца: Мы — людзі мірнай працы. |
| 2. Паміж лічэбнікам і лічэбнікам:<br>Пяццю пяць — дваццаць пяць. | 2. Калі перад ________ стаіць не:<br>Дзядзька Рыгор не ляснік. |
| 3. Паміж неазначальнай формай дзеяслова і неазначальнай формай дзеяслова:<br>Век пражыць — не поле перайсці. | 3. Калі паміж назоўнікам і назоўнікам знаходзіцца пабочнае слова, прыслоўе, часціца:<br>Яраш, вядома, архітэктар. Ягор Кацуба цяпер брыгадзір. Тамаш дык гаспадар, а Юзік хто? |
| 4. Паміж назоўнікам і неазначальнай формай дзеяслова ці наадварот:<br>Абавязак усіх — шанаваць і аберагаць птушак. Купіць касу — о, гэта штука! (Я. Колас). | 4. Калі паміж назоўнікам і назоўнікам ёсць словы: як, быццам, нібы, усё роўна:<br>Жыта як сцяна. Дзеці быццам кветкі. Вочы нібы васількі. |



© ТДА «Аверсэв»

| Працяжнік ставіцца | Працяжнік не ставіцца |
|---|---|
| 5. ________ — гэта, — вось, — значыць ________ (калі паміж дзейнікам і выказнікам ёсць названыя словы):<br>Кожны чалавек — гэта цэлы свет (К. Чорны). Вучоба — вось што галоўнае ў наш час для моладзі. | 5. Калі назоўнік перад назоўнікам:<br>Добры пчаляр ваш Алеська. |
| 6. Паміж назоўнікам і колькасным лічэбнікам (часам з іншымі словамі):<br>Фабрыка «Спартак» — адна з лепшых у краіне. Найбольшая глыбіня возера Свіцязь — пятнаццаць метраў. | 6. Паміж назоўнікам і назоўнікам ускосных склонаў:<br>Касцюм з чорнага бастону. Неба ў цёмных хмарах. Садок у колькі вішань (П. Броўка).<br>**Але**: калі лагічна выдзяляюцца, то працяжнік ставіцца: Песні і танцы — да знямогі. |
| 7. Паміж назоўнікам і ўсечанай формай дзеяслова:<br>Лабановіч — скок на ганак (Я. Колас). | 7. ________ ________ ________ (калі дзейнік у сярэдзіне выказніка):<br>Спрактыкаваны Базыль пчаляр. |

# Дадзеныя члены сказа

## Дапаўненне

**Дапаўненне** — дададзены член сказа, які абазначае прадмет і адказвае на пытанні ўскосных склонаў.

| Спосаб выражэння | Пытанні | Прыклады |
|---|---|---|
| 1. Назоўнікам | стаіць (з чым?) з грабянцом | Знoўку восень прыйшла і стаіць ля бяроз з залатым грабянцом (М. Лужанін). |
| 2. Займеннікам | зацікавіла (каго?) мяне | Мяне зацікавіла казка. |



© ТДА «Аверсэв»

| Спосаб выражэння | Пытанні | Прыклады |
|---|---|---|
| 3. Лічэбнікам | дзеліцца (на што?) на тры | Дзевяць дзеліцца на тры. |
| 4. Неазначальнай формай дзеяслова | папрасіла (аб чым?) пачытаць | Маці папрасіла Таню пачытаць кнігу. |
| 5. Прыслоўем | сеялася (што?) заўтра | У полі сеялася заўтра (Р. Барадулін). |
| 6. Іншымі часцінамі мовы ў значэнні назоўніка | успамінаў (што?) мінулае; дорыць (чаму?) жывому | Мікола ўспамінаў сваё мінулае. Усяму жывому зямля дорыць шчодрасць (Т. Хадкевіч). |
| 7. Фразеалагізмам | захацеў (чаго?) бярозавай кашы | «Бярозавай кашы захацеў?» — захрыпеў бацька (Л. Калодзежны). |

Дапаўненні бываюць прамыя і ўскосныя. Прамое дапаўненне адносіцца да пераходных дзеясловаў, абазначае прадмет, на які непасрэдна накіравана дзеянне, і выражаецца вінавальным склонам без прыназоўніка: Дзяды і продкі карчавалі ляды (С. Грахоўскі) ці родным склонам, калі:

а) дзеянне накіравана на частку прадмета: Косця выпіў малака.

б) выказнік мае пры сабе часціцу не: Я не бачыў гэтага фільма.

в) дапаўненне не мае значэнне вялікай колькасці або меры чаго-небудзь: Алесь прачытаў многа кніжак. Сабралі многа ягад.

Усе астатнія дапаўненні з'яўляюцца ўскоснымі

## Азначэнне

**Азначэнне** — даданы член сказа, які абазначае прымету прадмета і адказвае на пытанні які? чый?



© ТДА «Аверсэв»

## А. Дапасаваныя азначэнні

| Спосаб выражэння | Пытанні | Прыклады |
|---|---|---|
| 1. Прыметнікам | якім? якою? чыіх? | Сонейкам цёпленькім, зеленню вабнаю абдаравала зямельку вясна (Я. Купала). Матчыных слоў не забуду ніколі (К. Кірэенка). |
| 2. Дзеепрыметнікам | якія? | Весела зірнулі на свет вызваленыя ад холаду дрэвы (Я. Колас). |
| 3. Парадкавым лічэбнікам | якім? | Прылятае ён першым з далёкага выраю (Ю. Свірка). |
| 4. Займеннікам | якой? | Шчодра цвіў гэтай вясною сад (І. Мележ). |
| 5. Фразеалагізмам | якая? | Пашанцавала ёй — пагода стаіць як на заказ. |

## Б. Недапасаваныя азначэнні

| Спосаб выражэння | Пытанні | Прыклады |
|---|---|---|
| 1. Назоўнікам ва ўскосных склонах з прыназоўнікам і без яго | якія? якія? | Праз шчыліны ў вокнах пралазіць мароз. Слёзы радасці стаялі ў дзедавых вачах (К. Чорны). |
| 2. Займеннікам ва ўскосных склонах з прыназоўнікам і без яго | чый? чыіх? | І льецца смех іх разудалы (Я. Колас). У яго вачах жывых думка нейкая бліскала (Я. Колас). |
| 3. Неазначальнай формай дзеяслова | якое? | Жаданне вучыцца не пакідала Сымонку. |
| 4. Прыслоўем | якую? | Я любіў гэтую дарогу дадому. |



© ТДА «Аверсэв»

| Спосаб выражэння | Пытанні | Прыклады |
|---|---|---|
| 5. Дзеепрыслоўем | якой? | Пры стральбе лежачы Сымон закрыў усе мішэні. |
| 6. Выклічнік | якім? | З крыкам «Ура!» салдаты пайшлі ў атаку. |

## Прыдатак

**Прыдатак** — азначэнне, выражанае назоўнікам, які звычайна дапасуецца да азначаемага слова ў склоне і ліку: вочы-зоркі.

Прыдаткі могуць абазначаць: прафесію (жанчына-аграном), якасць (вочы-васількі), узрост, сацыяльнае становішча (бабка-пенсіянерка), роднасць (брат Алесь), відавое адрозненне (грыб-баравік), геаграфічныя назвы (рака Ясельда), назвы прадпрыемстваў (фабрыка «Камунарка»).

- Назоўнікі-сінонімы тыпу *шляхі-дарогі, бяда-гора* прыдаткамі не з'яўляюцца.
- Адзіночныя прыдаткі пішуцца праз злучок: а) калі абодва словы — агульныя назоўнікі (дуб-волат); б) калі ўласны назоўнік стаіць перад агульным (Нёман-рака)

## Акалічнасць

**Акалічнасць** — даданы член сказа, які характарызуе дзеянне ці прымету, розныя абставіны, пры якіх адбываецца дзеянне. У ролі акалічнасці выступаюць прыслоўі, дзеепрыслоўі, назоўнікі ва ўскосных склонах, неазначальная форма дзеяслова.

| Разрады акалічнасцей | Пытанні | Прыклады |
|---|---|---|
| 1. Месца | дзе? куды? адкуль? | не сядзіцца ў хаце; ісці ў лес; выйсці з дому |
| 2. Часу | калі? з якога часу? да якога часу? | прыехалі вечарам; дзяжурыць да раніцы; шчыравалі ад ранку да вечара |



© ТДА «Аверсэв»

| Разрады акалічнасцей | Пытанні | Прыклады |
|---|---|---|
| 3. Прычыны | чаму? па якой прычыне? | не наведаў з-за хваробы; скакалі ад радасці |
| 4. Мэты | для чаго? навошта? з якой мэтай? | зайсці адпачыць крыху; зрабіць назло |
| 5. Спосабу дзеяння | як? якім чынам? | звонка спяваў жаўранак; будавалі дом талакою |
| 6. Меры і ступені | колькі? як многа? у якой ступені? | прайсці дзесяць кіламетраў; развітацца назаўсёды; мы бясконца рады сустрэчы |
| 7. Умовы | пры якой умове? | гуляючы, не навучышся; пры жаданні можна пагаварыць |
| 8. Уступкі | нягледзячы на што? | ішлі наперакор стыхіі; нягледзячы на позні час, вяскоўцы не разыходзіліся |

## Аднародныя члены сказа

**Аднароднымі** называюцца такія члены сказа, якія адносяцца да аднаго і таго ж члена сказа, адказваюць на адно і тое ж пытанне, выконваюць адну і тую ж сінтаксічную функцыю і звязаны паміж сабой спалучальнай сувяззю.

што? што? што?

Наліваліся сокам грушы, крутабокія яблыкі, слівы (Б. Сачанка).



© ТДА «Аверсэв»

## Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа

| Коска ставіцца | Коска не ставіцца |
|---|---|
| 1. Паміж двума і больш аднароднымі членамі без злучніка:<br>О, О, О<br>Ходзіць дзед белабароды полем, лесам, пералескам (Я. Колас). | 1. Паміж аднароднымі членамі з адзіночнымі злучнікамі і, ды (=і), ці, або:<br>О і О<br>Заснулі навокал лясы і імшары (С. Шушкевіч). |
| 2. Паміж аднароднымі членамі з паўторнымі злучнікамі і—і, ні—ні, то—то, або—або і інш.:<br>і О, і О<br>І шуміць, і грыміць срэбразвонны ручэй (Я. Колас). | 2. Перад першым паўторным злучнікам:<br>то О, то О<br>Сонца то выгляне, то зноў схаваецца за хмары. |
| 3. Паміж аднароднымі членамі перад злучнікамі а, але, ды (=але), аднак:<br>О, а О<br>Прамені сонца не ззяюць, а тлеюць над лесам (М. Лынькоў). | 3. Перад і, які паўтараецца, але злучае розныя аднародныя члены:<br>О і О О і О<br>Ячшэ нямала дзён цікавых і раніц светлых і ласкавых (Я. Колас). |
| 4. Паміж парамі аднародных членаў са злучнікам і:<br>О і О, О і О<br>Вакол возера магутныя дубы і клёны, сосны і вязы. | 4. Калі аднародныя члены звязаны неаднолькавымі злучнікамі, што змяняюць адзін аднаго: і, ды (=і), ці, або (=ці):<br>О і О ды О<br>Грузды і махавікі ды лісічкі хутка напоўнілі нашы кошыкі (З. Бядуля). |
| 5. Перад другой часткай парных злучнікаў як — так і, не толькі — але і, калі не — то:<br>не толькі О, але і О<br>Мы набралі не толькі арэхаў, але і грыбоў. | 5. У непадзельных выразах ні тое ні сёе, ні рыба ні мяса, і так і сяк, ні жывы ні мёртвы, і туды і сюды:<br>Коні стаялі ні жывыя ні мёртвыя (І. Пташнікаў). |



© ТДА «Аверсэв»

## Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа

| Двукроп'е | Працяжнік |
|---|---|
| 1. Пасля абагульняльнага слова перад аднароднымі членамі:<br>ʘ: O, O, O, O<br>Усё заспакоілася: неба, і поле зжатага ўжо хлеба, і гэта даль, і лугавіны... (Я. Колас). | 1. Пасля аднародных членаў перад абагульняльным словам:<br>O, O і O – ʘ<br>Будынак, парк і агароджа — было ўсё слаўна і прыгожа (Я. Колас). |
| 2. Пасля слоў а іменна, напрыклад:<br>ʘ, а іменна: O, O, O, O<br>ʘ, напрыклад: O, O, O, O<br>Тут можна купіць усё, а іменна: ананасы, мандарыны, манга, какосы. | 2. Калі ёсць пабочныя словы словам, адным словам, то перад імі ставіцца працяжнік, а пасля іх — коска:<br>O, O, O — словам, ʘ<br>O, O, O — адным словам, ʘ<br>Начны лес, трывожны шум сосен, цішыня густых нетраў — адным словам, усё настройвала на роздум. |
| 3. Перад пералічэннем аднародных членаў у афіцыйна-дзелавым і навуковым стылі.<br>Вучоны савет пастанавіў:<br>1) ...;<br>2) ... . | 3. Калі аднародныя члены стаяць у сярэдзіне сказа і маюць удакладняльнае ці тлумачальнае значэнне:<br>... — O, O, O — ...<br>У лесе кожная мясцінка — лужок, палянка, баравінка — асобны твар і выраз мае (Я. Колас). |

### Двукроп'е — працяжнік

Калі абагульняльнае слова стаіць перад аднароднымі членамі сказа, а пасля іх сказ працягваецца:

Усё ў прыродзе: лес, поле, луг, невялічкае азярцо — пералівалася ў праменнях сонца.



© ТДА «Аверсэв»

# Адасобленыя члены сказа

**Адасобленымі** з'яўляюцца члены сказа, якія выдзяляюцца сэнсава і інтанацыйна з мэтай узмацніць іх значэнне.

## Адасобленыя азначэнні

| Умовы адасаблення | Прыклады |
|---|---|
| Дапасаваныя азначэнні, выражаныя дзеепрыметнікавымі і прыметнікавымі зваротамі, адасабляюцца, калі: | |
| 1) стаяць пасля азначаемага назоўніка | А лес, асветлены і абагрэты сонцам, пазіраў зусім-такі весела (Я. Колас). |
| 2) адносяцца да займенніка (незалежна ад яго месца ў сказе) | Чуйны да кожнага руху, ён пільна ўглядаўся ў густы ельнік. |
| 3) стаяць перад назоўнікам і маюць дадатковае акалічнаснае значэнне | Пакрытыя тоўстым пластом снегу, галіны дрэў гнуліся да самай зямлі (Я. Колас). |
| 4) стаяць перад назоўнікам і ўдакладняюць папярэдняе азначэнне | Малады, яшчэ не аб'езджаны як след, конік вырываўся з аглабель. |
| Дапасаваныя азначэнні, выражаныя адзіночнымі прыметнікамі і дзеепрыметнікамі, адасабляюцца, калі: | |
| 1) стаяць пасля назоўніка і маюць сэнсавую нагрузку | Валодзька, сярдзіты, не хацеў ісці дамоў. |
| 2) адносяцца да займеннікаў (незалежна ад месца ў сказе) | Яны, узбуджаныя, не ўспрымалі ніякіх парад. Узбуджаныя, яны... |
| 3) пасля азначаемага назоўніка не адно, а некалькі азначэнняў | Кожны куток, знаёмы і блізкі, усюды са мной (К. Кірэенка). |
| 4) калі ад азначаемага слова аддзелены іншымі членамі сказа | Жытнёвыя хвалі коцяцца, цёплыя, плынуць наўсцяж (К. Кірэенка). |



© ТДА «Аверсэв»

| Умовы адасаблення | Прыклады |
|---|---|
| Недапасаваныя азначэнні адасабляюцца, калі: | |
| 1) адносяцца да займеннікаў | Русы, з кучаравай галавой, ён выглядаў прыгожым і дужым. |
| 2) адносяцца да ўласнага імя | Без шапкі, у сінім гарнітуры, Ілья з захапленнем гаварыў пра турпаход. |
| 3) калі ўжываюцца з дапасаванымі азначэннямі | У тыя хвіліны прамільгнула перада мной маё дзяцінства, шумнае і ціхае, задзірлівае і добрае, з паспешлівымі радасцямі. |
| 4) стаяць пасля азначаемага назоўніка і выконваюць значную сэнсавую нагрузку | Лес, направа ад вёскі, шумеў панура і грозна (З. Бядуля). |

## Адасобленыя прыдаткі

| Умовы адасаблення | Прыклады |
|---|---|
| Прыдаткі адасабляюцца, калі: | |
| 1) адносяцца да агульных ці ўласных назоўнікаў і стаяць пасля іх | Касцы, ваякі мірнай працы, выходзяць з косамі на пляцы (Я. Колас). Іван, кладаўшчык калгаса, адчыніў кладоўку. |
| 2) адносяцца да асабовых займеннікаў (развітыя і неразвітыя) | У нас, студэнтаў, тыдзень гумару. Яны, вясковыя дзеці, не цураюцца працы. |
| 3) выражаны ўласнымі назоўнікамі, стаяць пасля агульных назоўнікаў і ўдакладняюць іх | Мой лепшы сябра, Пеця, займаецца ў авіямадэльным клубе. |



© ТДА «Аверсэв»

| Умовы адасаблення | Прыклады |
|---|---|
| 4) развітыя, стаяць перад уласнымі назоўнікамі і маюць дадатковае акалічнаснае значэнне | Сын дужа багатых бацькоў, Мірон не любіў экскурсій на фабрыку ці на завод. |
| 5) ужываюцца са словамі па імені, па прозвішчы, родам і інш. | Гэты малады трактарыст, родам з Залесся, працуе выдатна. |
| 6) звязаны з азначаемым словам злучнікамі ці, або і тлумачаць яго сэнс | Жаўна, або чорны дзяцел, гняздуецца ў Беларусі. |
| 7) ужываюцца са злучнікам як, што мае адценне прычыннасці | Пра Івана Фёдаравіча, як пра лепшага фермера, пісала «Звязда». |

## Адасобленыя дапаўненні

| Умовы | Прыклады |
|---|---|
| Адасабляюцца дапаўненні, выражаныя назоўнікамі ці займеннікамі ва ўскосных склонах з прыназоўнікамі: | |
| акрамя | Акрамя густога моху, мы нічога не знойдзем у дрымучым лесе. Хто, акрамя нас, дапаможа бабульцы. |
| апрача (апроч) | Апрача нямецкай мовы, Ліна добра ведала і англійскую. Ніхто не спаў, апроч малых дзяцей. |
| замест | На голых дрэвах, замест лісця, паклалі шэрань маразы (Я. Колас). |
| за выключэннем | Усё лета, за выключэннем дажджлівых начэй, я спаў у садзе. |
| Калі прыназоўнік замест мае значэнне за, дапаўненне не адасабляецца: Соня дзяжурыла замест Анюты. (Соня дзяжурыла за Анюту.) | |



© ТДА «Аверсэв»

## Адасобленыя акалічнасці

| Умовы адасаблення | Прыклады |
|---|---|
| Адасабляюцца акалічнасці, выражаныя: | |
| 1) адзіночнымі дзеепрыслоўямі, калі абазначаюць дадатковае дзеянне ці стан | Азірнуўшыся, Аня ўбачыла Васіліну. Вакол, ападаючы, шамацела лісце, угары шумеў густы вецер (І. Мележ). |
| 2) двума і больш дзеепрыслоўямі без паясняльных слоў | Дзядзька, думаючы, успамінаючы, прысеў на ўслоне і закурыў. |
| 3) дзеепрыслоўнымі словазлучэннямі незалежна ад пазіцыі ў сказе | Старыя хвоі і яліны, далёка кінуўшы галіны, глядзелі хораша, любоўна (Я. Колас). |
| 4) прыслоўямі ці прыслоўнымі словазлучэннямі, калі паясняюць другія акалічнасці, удакладняюць іх | Па полі, наўпрасткі да вёскі, ішоў чалавек (Я. Колас). |
| 5) назоўнікамі з прыназоўнікамі, калі ўдакладняюць сэнс папярэдняй акалічнасці | Тут, на палянцы, панавала цішыня. Дзесьці высока-высока, за самымі хмарамі, курлыкалі журавы (М. Лынькоў). |
| 6) назоўнікамі з прыназоўнікамі нягледзячы на, дзякуючы, калі стаяць перад паясняемым словам | Нягледзячы на трывожны час, рынак жыў сваім звычайным жыццём (А. Якімовіч). |
| 7) назоўнікамі з прыназоўнікамі насуперак, згодна з, у адпаведнасці з, з прычыны і інш. | Насуперак жаданню, Лабановіч доўга не мог заснуць (Я. Колас). |
| Не адасабляюцца акалічнасці: | |
| 1) выражаныя адзіночнымі дзеепрыслоўямі, якія абазначаюць спосаб дзеяння і стаяць у канцы сказа | Якаў Дубавец ішоў не спяшаючыся. |



© ТДА «Аверсэв»

| Умовы адасаблення | Прыклады |
| --- | --- |
| Не адасабляюцца акалічнасці: | |
| 2) выражаныя фразеалагізмамі | Сцёпка сядзеў угнуўшы галаву (Я. Колас). |
| 3) калі стаяць пасля прыслоўяў і звязаны з імі злучнікам і выступаюць як аднародныя члены | Імкліва і булькаючы выбягала з крынічкі вада. |
| 4) калі перад імі знаходзяцца часціцы толькі, нават | Лявон пайшоў нават не развітаўшыся. |

# Зваротак

**Зваротак** — гэта слова ці спалучэнне слоў, якое называе асобу ці прадмет, да якіх звяртаюцца з мовай.

## Знакі прыпынку пры зваротках

| Месца ў сказе | Знакі прыпынку | Прыклады |
| --- | --- | --- |
| у пачатку | коска пры звычайнай інтанацыі,<br><br>клічнік пры ўзмоцненай інтанацыі | Пачакай, Варвара, пра вас я ўсё ведаю (А. Асіпенка).<br>Сябры! Прыгожая зіма ў нас па ўсёй краіне (П. Глебка). |
| у сярэдзіне | коскі з абодвух бакоў | Шуміце ж, шчаслівыя родныя нівы, пад ціхія шэпты прысад (П. Глебка). |
| у канцы | коска перад звароткам, пасля — знак, які патрабуецца паводле інтанацыі | Эх, слаўна ў лесе, слаўна, братцы! (Я. Колас). Што чытаеш, Пятрок? Прыгожыя вы, родныя палі. |



© ТДА «Аверсэв»

| Месца ў сказе | Знакі прыпынку | Прыклады |
|---|---|---|
| зваротак раздзяляецца на часткі | коскамі выдзяляецца кожная частка | А, Мірон, а я цябе, дарагі, не пазнаў. |
| пры зваротку часціцы о, ну | коскай не аддзяляюцца | Ён быў, о Нёман, твой пясняр. |
| пры зваротку выклічнікі о, ну, эх і інш. | аддзяляюцца коскай | Ну, голубе, бывай (Я. Колас). Эх, час касьбы, вясёлы час! І я з ім цешыўся не раз (Я. Колас). |

## Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах

| Коска ставіцца пры параўнальных зваротах, калі: | |
|---|---|
| 1) адносяцца да ўказальных слоў так, такі | Вецер свішча так, як звер (Я. Колас). Выплыў месяц, такі круглы, нібы шар. |
| 2) адносяцца не да ўказальных слоў, але маюць выразнае параўнальнае значэнне | Смела і ўпэўнена, як нейкі асілак-забіяка, ходзіць па полі вецер (Я. Колас). |
| 3) перад як у выразах не хто іншы, як; не што іншае, як | Выратаваў дзяцей не хто іншы, як Язэп Данілавіч. |
| Коска не ставіцца, калі параўнальныя звароты: | |
| 1) з'яўляюцца ўстойлівымі выразамі | Спіць як пшаніцу прадаўшы. |
| 2) уваходзяць у склад выказніка | Жыта як сцяна. |
| 3) ужываюцца са значэннем «у якасці» | Малько аглядаў пасевы як аграном. Усе ганарыліся Алесяй як зоркай эстрады. |



© ТДА «Аверсэв»

# Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы

**Пабочнымі** называюцца такія словы, словазлучэнні і сказы, якія граматычна не звязаны з членамі сказа, не з'яўляюцца імі і выражаюць адносіны таго, хто гаворыць, да выказанай думкі.

| Значэнні | Пабочныя словы і словазлучэнні | Прыклады |
|---|---|---|
| 1. Розная ступень упэўненасці | вядома, безумоўна, бясспрэчна, зразумела, натуральна, сапраўды, здаецца, магчыма і інш. | Сапраўды, набліжалася навальніца. Відаць, добры гаспадар быў Нявада! (К. Чорны). Садок быў, праўда, невялічкі (Я. Колас). |
| 2. Розныя пачуцці | на жаль, на радасць, на шчасце, на бяду, як на тое ліха, на здзіўленне і інш. | На жаль, мы не былі ў Белавежскай пушчы. На шчасце, снегапад неўзабаве скончыўся. |
| 3. Крыніца паведамлення | па словах (каго-небудзь), як кажуць, па-мойму, на думку (каго-небудзь), паводле звестак і інш. | Мінёр, кажуць, памыляецца раз у жыцці. Па-мойму, Царэшка — шчаслівы чалавек. |
| 4. Парадак думак, іх сувязь, паслядоўнасць выказвання, вынік | па-першае, па-другое, па-трэцяе, наадварот, нарэшце, такім чынам, значыць, у прыватнасці і інш. | Спякота прымусіла нас, нарэшце, увайсці ў гай. Калі баіцца, значыць, вінаваты. |



© ТДА «Аверсэв»

| Значэнні | Пабочныя словы і словазлучэнні | Прыклады |
|---|---|---|
| 5. Спосаб афармлення думак | інакш кажучы, карацей кажучы, па сутнасці, можна сказаць, ва ўсякім разе, трэба думаць і інш. | Я нават, па праўдзе кажучы, і не спадзяваўся, што гэтак выйдзе (Я. Скрыган). Ва ўсякім разе, я ўдзячны Шуры. |
| 6. Спосаб прыцягнуць увагу суразмоўцы | зразумей, думаеце, разумееце, прабачце, калі ласка, згадзіцеся, ці ведаеце, як бачыце і інш. | Скажы, калі ласка, Антон, куды ты будзеш паступаць вучыцца? Згадзіцеся, гэтая задача не для вучняў сёмага класа. |

• Пабочныя сказы выражаюць тыя значэнні, што і пабочныя словы: Мая душа, я помню, з дзіцячых гадоў шукала цудаў.

• Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы звычайна стаяць у пачатку ці ў сярэдзіне сказа і выдзяляюцца коскамі: Увесь свет, здавалася яму, скакаў лявоніху (Я. Колас).

• Калі пабочныя словы, словазлучэнні і сказы суправаджаюцца ўзмоцненай інтанацыяй і лагічна выдзяляюцца, яны аддзяляюцца ці выдзяляюцца працяжнікамі: Адным словам — наш клас стаў пераможцам.

• Калі яны вымаўляюцца з клічнай інтанацыяй і стаяць у сярэдзіне сказа, то выдзяляюцца працяжнікам, а пасля іх ставіцца клічнік ці пытальнік: Антоська — хоць ты плач! — не хацеў заставацца дома.

• Пры аслабленай сувязі са зместам сказа яны выдзяляюцца дужкамі: Жучка (так звалі сабачку) была вельмі ласкавая.

## Устаўныя словы, словазлучэнні і сказы

**Устаўнымі** называюцца словы, словазлучэнні і сказы, якія ўводзяцца ў сказ для выражэння дадатковых паведамленняў, тлумачэнняў, удакладненняў зместу выказвання.



© ТДА «Аверсэв»

Яны заўсёды стаяць у сярэдзіне сказа або ў канцы і выдзяляюцца дужкамі ці працяжнікамі: Міхал — навошта ўжо таіцца? — любіў-такі павесяліцца (Я. Колас). Кожны раз перад выступленнем былі спеўкі (рэпетыцыі) (Я. Маўр).

## Сінтаксічны разбор простага сказа

### Парадак разбору

1. Тып сказа паводле мэты выказвання.
2. Клічны ці няклічны (паводле інтанацыі).
3. Сцвярджальны ці адмоўны (па характару адносін да рэчаіснасці).
4. Тып паводле будовы (просты).
5. Тып паводле структуры граматычнай асновы (двухсастаўны ці аднасастаўны; від аднасастаўнага: пэўна-асабовы, няпэўна-асабовы, абагульнена-асабовы, безасабовы, назыўны).
6. Развіты ці неразвіты (па наяўнасці даданых членаў сказа).
7. Поўны ці няпоўны (па наяўнасці членаў сказа).
8. Няўскладнены ці ўскладнены (вызначыць, чым ускладнены).
9. Зрабіць аналіз па членах сказа.
10. Зрабіць графічны запіс разбору.

### Узор разбору

Напевы дзіўныя збіраю ў жытнім полі і бары (А. Астрэйка).

Апавядальны, няклічны, сцвярджальны, просты, аднасастаўны, пэўна-асабовы, развіты, поўны, ускладнены аднароднымі акалічнасцямі месца (у полі, у бары).

*Збіраю* — галоўны член сказа, выражаны дзеясловам 1-й асобы цяперашняга часу абвеснага ладу;

*напевы* — дапаўненне, прамое, выражана назоўнікам мужчынскага роду вінавальнага склону, множнага ліку;

*у полі* — акалічнасць месца, выражаная назоўнікам ніякага роду, меснага склону, адзіночнага ліку з прыназоўнікам *у*;

*у бары* — акалічнасць месца, выражаная назоўнікам мужчынскага роду, меснага склону, адзіночнага ліку з прыназоўнікам *у*;

*дзіўныя* — дапасаванае азначэнне, выражанае прыметнікам у форме вінавальнага склону, множнага ліку;

*жытнім* — дапасаванае азначэнне, выражанае прыметнікам у форме меснага склону, адзіночнага ліку, ніякага роду.



© ТДА «Аверсэв»